**В.І.Саітава**, *дацэнт*

# ДЗЕЙНАСЦЬ КАФЕДРЫ ПА ФАРМІРАВАННІ Ў СТУДЭНТАЎ ПРАФЕСІЙНАЙ НАКІРАВАНАСЦІ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ КРАЯЗНАЎЧАГА КРЫНІЦАЗНАЎСТВА

Дысцыпліна "Краязнаўчае крыніцазнаўства" вывучаецца на трэцім курсе факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК). Актуальнасць названай дысцыпліны абумоўлена павышэннем значэння краязнаўчай інфармацыйнай работы, якая на сучасным этапе стала адным з галоўных кірункаў дзейнасці універсальных і спецыяльных бібліятэк. Аналагі распрацаванага курса аўтару невядомы. Падставай спалучэння краязнаўства і крыніцазнаўства ў якасці новай вучэбнай і навуковай дысцыпліны з'яўляецца інтэгратыўны характар гэтых навук, прызнанне іх інтэгрыруючай ролі ў сферы навукі (адносна многіх іншых навук) і ў сферы культурна-асветніцкай дзейнасці, якую яны паспяхова выконваюць у сучасным грамадстве. Звязваючы гэта палажэнне з такой важнай задачай прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў, як умелае выяўленне і выкарыстанне існуючых інфармацыйных аб'ектаў для мэт бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, можна ўдакладніць узаемадзеянне "Краязнаўчага крыніцазнаўства" з сумежнымі навуковымі і вучэбнымі дысцыплінамі і адлюстраваць яго спецыфіку. Курс "Краязнаўчае крыніцазнаўства" ўзнік на аснове такіх навуковых і вучэбных дысцыплін, як "Крыніцазнаўства", "Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі", "Краязнаўства", "Дакументазнаўства", "Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства".

Крыніцазнаўства мае складаную структуру. Гэта шматгаліновая навуковая і вучэбная дысцыпліна. Крыніцазнаўства дыферэнцыруецца з улікам зместу асобных навуковых дысцыплін, у ім вылучаюць вывучэнне крыніц, прысвечаных асобным рэгіёнам краіны, гістарычным перыядам, асобам, падзеям і г. д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Краязнаўства як любая галіна навукі не можа не мець корпуса крыніц, на базе якіх яно ўзнікла і паспяхова развіваецца. Лагічным уяўляецца ў гэтай структуры і выдзяленне кірунку, прадметам якога з'яўляецца вывучэнне крыніц, прысвечаных адміністрацыйна-тэрытарыяльным, фізіка-геаграфічным адзінкам, населеным пунктам і іншым аб'ектам дробнага тэрытарыяльнага паходжання ў межах краіны. Магчыма спаслацца на аднаго з вядучых сучасных беларускіх археографаў Ю.У.Несцяровіча, які, абгрунтоўваючы структуру археаграфічных выданняў па "тэматычнаму аб'екту публікацыі", вылучыў і групу выданняў "па гісторыі пэўнай мясцовасці" [1, с.7].

У крыніцазнаўстве даследуюцца крыніцы рознага паходжання і распрацаваны розныя варыянты класіфікацыі крыніц. Галіновыя крыніцазнаўчыя дысцыпліны накіраваны на структураванне корпуса крыніц, якія дапамагаюць ствараць новыя галіновыя веды, іх класіфікацыю і фарміраванне спецыфічнага прафесійнага мыслення. У краязнаўстве выкарыстоўваюцца ўсе віды крыніц, якія даследуюцца ў сучасным крыніцазнаўстве, таму што само краязнаўства інтэгрыруе шматлікія галіны і мае складаную структуру. Так, для турыстычнага краязнаўства асабліва актуальныя некаторыя групы рэчавых крыніц: архітэктурныя помнікі, помнікі прыроды і інш. Для краязнаўцаў-археолагаў найважнейшымі з'яўляюцца рэчавыя крыніцы, здабытыя падчас археалагічных раскопак, але вельмі важныя пісьмовыя і інш.

Для бібліятэчна-інфармацыйнага (ці бібліятэчна-бібліяграфічнага) краязнаўства важнейшымі з'яўляюцца пісьмовыя (тэкставыя), аўдыёвізуальныя і машыначытальныя крыніцы, што адпавядае прызначэнню бібліятэк як сацыяльнага інстытута. Вядома, што ў дзейнасці бібліятэк можна знайсці і нямала прыкладаў выкарыстання рэчавых крыніц, напрыклад пры афармленні інтэр'ера ў мясцовым стылі, дэманстрацыі аб'ектаў падчас правядзення краязнаўчых мерапрыемстваў.

Менавіта інстытуяльная спецыфіка абумоўлівае базавае значэнне такога курса, як "Дакументазнаўства", а таксама ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пэўнай ступені дысцыплін "Гісторыя беларускай кнігі", "Фондазнаўства". Калі для гісторыка адносна крыніцазнаўства дамінуючымі выступаюць класіфікацыя гістарычных дакументаў і аналіз, то паспяховасць прафесійнай дзейнасці для бібліятэкара-бібліёграфа залежыць ад разумення "функцый дакументаў, ведання іх асноўных разнавіднасцей, магчымасцей, прадстаўляемых рознымі групамі дакументаў".

Падчас вывучэння курса "Дакументазнаўства" студэнты пазнаюць дакументы як матэрыяльныя носьбіты з зафіксаванай інфармацыяй, прызначанай для яе захавання і перадачы ў часе і прасторы, прыдатнай для выкарыстання ў дакументацыйных працэсах, авалодваюць шматаспектнай класіфікацыяй дакументаў.

Разам з тым у адрозненне ад "Дакументазнаўства", "Бібліятэчнага і бібліяграфічнага краязнаўства" ў "Краязнаўчым крыніцазнаўстве" тая ці іншая класіфікацыя дакументаў, як правіла, змяшаная ("плаваючая"), будуецца на сінтэзе прымет для вылучэння з дакументнага патоку базавых груп дакументаў – крыніц, якія ў найбольшай ступені ахопліваюць інфармацыю актуальную, поўную і дакладную аб дадзеным рэгіёне, па асобных галінах і тэмах краязнаўства. З дапамогай іх магчыма генерацыя новых краязнаўчых ведаў.

З улікам ведаў, уменняў і навыкаў, якія фарміруюцца падчас вывучэння асноўнага вучэбнага курса "Бібліятэчнае і бібліяграфічнае краязнаўства", у межах "Краязнаўчага крыніцазнаўства" не разглядаецца тэма "Бібліяграфічныя дапаможнікі як крыніцы краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі". Мы палічылі, што прафесійная бібліяграфічная падрыхтоўка, што атрымліваюць студэнты факультэта, павінна дапамагаць ім сінтэзаваць бібліяграфічныя веды ў запатрабаваным змястоўным кірунку. Таму пры выкладанні "Краязнаўчага крыніцазнаўства" надаецца ўвага толькі бібліяграфічнаму апарату іншых дакументных крыніц, якія не вывучаюцца ў курсах бібліяграфічных дысцыплін.

Пры вывучэнні "Краязнаўчага крыніцазнаўства" як навуковай і вучэбнай дысцыпліны вырашаюцца пошукавая,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасная, светапоглядная функцыі. Сутнасцю пошукавай функцыі краязнаўчага крыніцазнаўства з'яўляецца выўленне дакументна фіксаваных ведаў, дастатковых і інфармацыйна каштоўных для генерыравання новых ведаў аб рэгіёне.

Сутнасць каштоўнаснай функцыі ў тым, што аналіз і тэарэтычнае абагульненне дакументных фактаў суадносяцца з мэтавымі і карыстальніцкімі фактарамі інфармацыйна-спажывецкай дзейнасці, з ацэнкай іх інфармацыйнага патэнцыялу, жанрава-стылістычных якасцей.

Сутнасць светапогляднай функцыі заключаецца ў тым, што інфармацыйнае забеспячэнне ў спалучэнні з любым відам краязнаўчых даследаванняў, краязнаўчай дзейнасці спрыяе фарміраванню спецыфічнага інфармацыйна-рэгіянальнага стылю і логікі мыслення, выхаванню ў навучэнцаў патрыятызму.

Спецыфічнае прафесійнае мысленне бібліятэкара-бібліёграфа як краязнаўцы ў межах курса "Краязнаўчае крыніцазнаўства", на наш погляд, павінна ахопліваць: 1) асноўны паняційны склад актуальнай на сучасным этапе і ў сваім родзе класічнай часткі краязнаўства, без якой дзейнасць з аб'ектамі краязнаўчай інфармацыі, зносіны з прадстаўнікамі краязнаўства (навукоўцамі, спецыялістамі і аматарамі) ускладняюцца; 2) веды аб дакументных крыніцах краязнаўства; 3) спецыфічную метадалогію краязнаўчага крыніцазнаўства.

Для абгрунтавання змястоўнага напаўнення дысцыпліны і выяўлення паняційнага складу актуальнай часткі краязнаўства, вакол якой засяроджаны асноўныя даследаванні, выкарыстоўваліся розныя метады, што дапамагло вызначыць змест курса. У структуру курса ўключаны тэмы, прысвечаныя крыніцам інфармацыі па рэгіянальных аспектах заканадаўства, справаводства, статыстыкі, геральдыкі і генеалогіі, анамастыкі і тапанімікі, аб рэгіянальных асаблівасцях беларускай мовы. Асобныя тэмы прысвечаны краязнаўчым фотадакументам, перыёдыцы; апавядальным крыніцам: мемуарыстыцы, адлюстраванню асаблівасцей рэгіёнаў у творах мастацтва і мастацкай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для авалодання ведамі аб дакументных крыніцах краязнаўства ва ўсіх тэмах класіфікуюцца тэкставыя крыніцы, у большасці вылучаюцца важнейшыя электронныя. Перавага аддадзена друкаваным крыніцам і электронным базам даных, электронным выданням. Выкарыстаны класіфікацыі крыніц, прынятыя ў шэрагу навук: геральдыцы і генеалогіі, дыялекталогіі, тапаніміцы, мемуарыстыцы і інш. У большасці тэм праведзена дапрацоўка класіфікацыі. Як правіла, гэта дапаўненне ці выключэнне пэўных груп крыніц.

1. Прымета характару знакавых сродкаў замацавання інфармацыі выкарыстана непасрэдна для вылучэння тэмы “Фотадакументы як крыніцы краязнаўчай інфармацыі”. Гэта ж прымета дазволіла ў межах большасці тэм выдзеліць крыніцы тэкставыя (пісьмовыя), іконаграфічныя (творы выяўленчага мастацтва) і ідэаграфічныя, а менавіта картаграфічныя.

2. Па прымеце рэгулярнасці выхаду вылучана тэма “Мясцовы перыядычны друк і краязнаўчыя перыядычныя выданні”.

3. Па прымеце спосабу распаўсюджання дакументаў у грамадстве выдзелены віды апублікаваных, рукапісных і электронных дакументаў.

4. З улікам сфер стварэння і пераважнага выкарыстання дакументаў, а таксама сфер дзейнасці і мэт выкарыстання інфармацыі выдзелены афіцыйныя, навуковыя, даведачныя дакументы, абмежавана навукова-папулярныя, літаратурна-мастацкія і некаторыя іншыя.

Такім чынам, у кожнай тэме на падставе шэрага прымет выдзяляюцца іх пэўныя групы, знітаваныя прынцыпамі і функцыямі краязнаўчага крыніцазнаўства.

Аб авалоданні спецыфічнай метадалогіяй краязнаўчага крыніцазнаўства заўважым наступнае. Як ужо адзначалася, элементы крытычнага мыслення, крытычнага аналізу адносна крыніц краязнаўства павінны выпрацоўвацца падчас вывучэння курса, далей яны пастаянна паглыбляюцца ў прафесійнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнты таксама паглыбляюць ўменні і навыкі пошуку, бібліяграфічнага аналізу дакументаў, іх адбору, вучацца рэканструяваць бібліяграфічную інфармацыю паводле тых яе элементаў, якія выкарыстоўваліся ў розныя гістарычныя эпохі, ідэнтыфікаваць звесткі на замежных, асабліва на лацінскай і польскай, мовах. Дарэчы, моўны бар'ер з'яўляецца істотнай перашкодай для студэнтаў, пажадана было б для спецыялізацыі прапанаваць курс (факультатыў ці іншую форму) польскай мовы. Падобныя мэты ставяцца адносна авалодання метадамі выяўлення, ацэнкі дакладнасці, паўнаты фактаграфічнай інфармацыі.

Для навучання студэнтаў выкарыстоўваюцца розныя віды заняткаў і формы кантролю ведаў. Напрыклад, на лабараторных работах выконваюцца заданні, звязаныя з выяўленнем крыніц, агульным бібліяграфічным аналізам, выкананнем пошукавых заданняў, у тым ліку па пошуку фактаграфічнай і бібліяграфічнай інфармацыі, рыхтуюцца аналітычныя агляды крыніц. Частка заданняў на лабараторных работах маюць індывідуальны характар, праводзяцца ў ЦБ НАН і НББ. Шэраг лабараторных работ праводзяцца з выкарыстаннем Internet. У прыватнасці, студэнты знаёміліся з беларускімі краязнаўчымі часопісамі ў Internet, з фотагалерэямі, краязнаўчымі сайтамі рознага характару, спрабуючы даваць ім каштоўнасную ацэнку.

---

1. *Несцяровіч Ю.У.* Праблема класіфікацыі археаграфічных публікацый і беларускія археаграфічныя выданні: Гісторыка-археаграфічны нарыс. – Мн.: БелНДІДАС, 1997. – 56 с.

2. *Справочник* библиографа / Науч. ред. А.Н.Ванеев, В.А.Минкина. – 2-е изд., перераб. и доп. – СПб.: Профессия, 2003. – 560 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ